ВУЧОБА ПРАЦА І АДПАЧЫНАК

У сённяшнім, апошнім у гэтым навучальным годзе нумары газеты «Беларускі універсітэт», мы ставім словы — вучоба, праца і адпачынак побач. Сесія на зыходзе. Многія студэнты і цэлыя групы і курсы ўжо здалі экзамены, астатнія штурмуюць апошнія рубяжы. І разам з тым увесь калектыў нашага ардэнаноснага універсітэта актыўна рыхтуецца да трэцяга семестра і летняга адпачынку.

Трэба адзначыць, што, выконваючы пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе і сярэднім спецыяльным навучанні, універсітэт у юбілейным годзе дабіўся далейшага паляпшэння якасці навучання з улікам патрабаванняў сучаснай вытворчасці, навукі, тэхнікі, культуры. Ужо папярэднія вынікі сведчаць аб тым, што выкананне намечаных пастановай мер жыццятворна адбілася на дзейнасці ўсіх факультэтаў, большасці кафедраў і лабараторый. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала паспяховае ажыццяўленне ўзятых калектывам у гонар 50-годдзя Савецкай улады сацыялістычных абавязацельстваў. Пройдзе яшчэ адзін тыдзень і можна будзе канчаткова падвесці вынікі экзаменаў і яшчэ раз сказаць многа цёплых слоў у адрас прафесараў, выкладчыкаў, якія прыклалі шмат сіл і старання для таго, каб рыхтаваць для радзімы яшчэ больш кваліфікаваных спецыялістаў. Дарэчы, у гэтым годзе краіна атрымае звыш двух тысяч выхаванцаў нашага універсітэта. Гэта, бадай, самы большы выпуск за ўсю гісторыю існавання старэйшай навучальнай установы рэспублікі.

Падрыхтоўка да юбілею адбілася і на арганізацыі працоўнага семестра і культурнага адпачынку. Яскравым сведчаннем таму могуць служыць наступныя лічбы. Толькі на будоўлях Беларусі будзе занята 1050 студэнтаў, на цаліну паедзе каля 700, у Польшчу, Чэхаславакію, ГДР—40, а агульная колькасць «байцоў» трэцяга семестра перавысіць 2000 чалавек. Універсітэцкіх будаўнікоў можна будзе сустрэць на Ангары і Краснадары, у Крыме і ва Уральскай вобласці, на Мінскім аўтамабільным заводзе і ў калгасах Случчыны. Такая геаграфія працоўнага семестра дасць магчымасць нашым юнакам і дзяўчатам не толькі прынесці вялікую матэрыяльную карысць радзіме, але і ўзбагаціць свае веды, знайсці многа новых сяброў, пасталець. І гэта не ўсё. 1300 юнакоў і дзяўчат ужо ўладкавалі свае рукзакі, каб накіравацца на педагагічна-вытворчую практыку, 300 будуць працаваць піянерважатымі, каля паўтысячы паправяць сваё здароўе ў дамах адпачынку і спартыўным лагеры, сотні накіруюцца ў турысцкія паходы. Гэтыя лічбы можна было б працягваць, але і адсюль бачна, як рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком і іншыя грамадскія арганізацыі клапоцяцца аб тым, каб у нашым універсітэце выхоўваліся спецыялісты з трывалымі і глыбокімі тэарэтычнымі ведамі, добрымі практычнымі навыкамі, ідэйна загартаваныя і фізічна вынослівыя.

Развіваючыся на некалькі месяцаў з усім калектывам, рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» жадае прафесарска-выкладчыцкаму калектыву, усім супрацоўнікам, аспірантам і студэнтам цікавага адпачынку і плённай працы. Мы таксама вітаем завочнікаў і выказваем упэўненасць, што ў бягучай сесіі яны яшчэ вышэй падніму ць славу нашага ардэнаноснага універсітэта.



Мнагалюдна ў гэтыя дні ў бібліятэцы нашага універсітэта. З ранку да позняга вечара старанна і напружана над авалодваннем ведаў працуюць у ёй студэнты.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (675) ● ПЯТНІЦА, 23 чэрвеня 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

БЫВАЙ, АРДЭНАНОСНЫ!

Маршруты... маршруты. Колькі іх у студэнтаў нашага універсітэта пасля здачы летняй сесіі. Тут і дамы адпачынку, і санаторыі, турысцкія паходы і экскурсіі, працоўныя будні на цаліне і Ангары, будоўлі Беларусі і замежных сацыялістычных краін. А ў тых, хто абараніў дыпломныя работы, здаў дзяржаўныя экзамены, напрамак маршрута — школы, заводы, фабрыкі, розныя культурныя ўстановы краіны. 630 высокакваліфікаваных фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, гісторыкаў, філолагаў, біёлагаў, фізіолагаў, журналістаў, юрыстаў, геграфаў стацыянарнага навучання нашага універсітэта днямі ўрачыста атрымаюць дыпломы аб заканчэнні Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Але памяць аб родным БДУ ў іх застанецца на ўсё жыццё. Групамі, курсамі філолагі і гісторыкі, географы і матэматыкі фатаграфуюцца на фоне карпусоў універсітэта, дзе прайшлі пяць год вучобы, — у аўдыторыях, лабараторыях. Гэтыя фотаздымкі складаюць альбомы, у якіх адлюстроўваецца ўсё жыццё студэнта, яго таварышаў. Добрай памяццю будуць таксама для выпускнікоў святочныя вечары, развітанні з родным універсітэтам, з прафесарска - выкладчыцкім калектывам і, наогул, са студэнцкім жыццём. Як яны праходзяць, мы расказвалі ўжо ў адным з нумароў газеты. Урачыста і па-святочнаму гэтую традыцыю адзначаюць на ўсіх факультэтах. Дэканы, выкладчыкі заклікаюць выпускнікоў ніколі не забываць родны універсітэт, поспехамі ў працы памнажаць яго слаўныя традыцыі.

Нельга не ўспомніць тут і шчырай падзякі, якой прасякнута выступленне кожнага дыпламанта ў адрас рэктарата, парткома, дэканаў, усіх прафесараў, выкладчыкаў, якія так многа сіл аддалі для выхавання будучых спецыялістаў...

Ітак, 630 выпускнікоў пакідае наш універсітэт сёлета, а 1 верасня на іх месца прыйдуць 2000 першакурснікаў.

Гэтыя лічбы — прыклад вялікага росту універсітэта, росту яго аўтарытэту і жадання, менавіта, ў ім атрымаць вышэйшую адукацыю.

Бывайце, нашы дарагія выпускнікі. Шчаслівай вам жыццёвай дарогі!

Б. СЫЧОЎ.

ПЛЮС ШЭСЦЬСОТ...

У студэнтаў стацыянарнага навучання сесія ў асноўным закончана. Але напружаныя дні ва універсітэце працягваюцца. Пачынаюцца экзамены ў завочнікаў. Каля тысячы іх будуць трымаць справаздачы па самых розных дысцыплінах. Пачаліся ўступныя экзамены на першыя курсы філалагічнага, біялагічнага, матэматычнага і іншых факультэтах.

У трэцякурснікаў-біёлагаў ідзе поўным ходам абарона дыпломных работ, у журналістаў — здача апошняга экзамена. А філосафы закончылі штурм ведаў ва універсітэце, і днямі ва ўрачыстых абставінах ім былі ўручаны дыпломы. 25 філосафаў даў універсітэт нашай краіне ў гэтым годзе. Аб тым, што гэта выдатна падрыхтаваныя ва ўсіх адносінах людзі, гавораць іх залікоўкі. Амаль адны выдатныя адзнакі ў Я. Бірмана, І. Зубава, І. Калабухава, М. Лібентава. А вось С. Шаш і Я. Мусальнікаў на працягу пяцігадовага навучання атрымлівалі толькі адны пяцёркі. Гэта выдатны поспех. Ім уручаны дыпломы выдатнікаў.

Каля 600 высокакваліфікаваных спецыялістаў падрыхтаваў завочны факультэт БДУ для краіны.

А. СВІРЫДАЎ.

АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ

Нядаўна ў адным з нумароў нашай газеты расказвалася аб вялікай навукова-даследчай рабоце дацэнта кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму Р. А. Левіна. Учора на пасяджэнні Вучонага савета ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю па актуальных праблемах марксісцка-ленінскай тэорыі пазнання.

У бягучым месяцы на пасяджэнні гэтага савета абаранілі кандыдацкія дысертацыі былыя аспіранты універсітэта: выхаванец кафедры палітэканоміі П. П. Борсук, кафедры гісторыі філасофіі і логікі — Н. П. Дземях, Г. А. Ганусевіч і іншыя. Агульная колькасць абароненых на Вучоным савеце гуманітарных навук дысертацый толькі ў чэрвені складзе сем кандыдацкіх і адну доктарскую.

С. АКУЛІЧ.

ПАЕДУЦЬ ЛЕПШЫЯ

У рэдакцыю газеты прыходзяць пісьмы, у якіх чытачы цікавяцца аб тым, колькі самадзейных артыстаў паедзе на свята песні ў Тарту і якая іх праграма. На гэтыя пытанні адказвае старшыня мастацкага клуба БДУ Вася Літвінка:

— Калектыў ад нашага універсітэта будзе, бадай, самым унушальным у Тарту. Мы настройваем сябе толькі на выдатнае выступленне. Вядома, дасягнуць гэтага будзе цяжка, бо ў Тарту і ў многіх іншых гарадах моладзь умее спяваць не горш нашай. Але для выдатнага выступлення ў нас ёсць усе магчымасці — было праведзена многа рэпетыцый, у рэпертуары нашых спевакоў — лепшыя беларускія і рускія песні, эстонская «Сінічку вецер закалыхаў» і іншыя. Днямі стала вядома, што колькасць артыстаў, якія паедуць на свята песні ў Тарту, складзе 220 чалавек.

НА РАДЫЁХВАЛЯХ — УЗЛЁТАЎЦЫ

Адбылося пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Але на гэты раз не ў рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт», як звычайна, а на радыёстудыі Беларускага рэспубліканскага радыёкамітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню.

Уся Беларусь змагла прасачыць, як праходзяць пасяджэнні «Узлёта», якія планы студэнцкіх паэтаў на будучае, а таксама пачуць іх новыя вершы. Юрка Голуб, Анатоль Казловіч, Сяргей Законнікаў і многія іншыя выступілі перад радыёслухачамі з кароткімі прамовамі, прачыталі вершы.

А неўзабаве ў членаў літаратурнага аб'яднання «Узлёт» будзе яшчэ адна вялікая радасць — выйдзе з друку двухтысячным тыражом новы зборнік вершаў «Натхненне».

А. РАМАНЕНКА.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА З ПРАФЕСІЯЙ

З кожным годам у нашым універсітэце ўзмацняецца сувязь тэарэтычнай вучобы з практыкай. Перабудоўваюцца планы, у іх уносяцца новыя важныя карэктывы, канкрэтныя палажэнні для таго, каб прахаджанню практыкі надавалася больш важкае значэнне. Менавіта гэтая думка і падкрэслівалася ў дакладзе прарэктара па вучэбнай рабоце А. Я. Малышава на Аб'яднаным вучоным савеце нашага універсітэта.

Таму кантынгент студэнтаў, якія будуць праходзіць практыку ў розных установах, небывалы ў гэтым годзе — 1300 чалавек. Гэта філолагі, географы, хімікі і многія іншыя. У іх адбудзецца летам першая сустрэча са сваёй будучай прафесіяй. Практыка дасць плённы штуршок для далейшай работы ва універсітэце, з'явіцца сур'ёзнай праверкай агульнай тэарэтычнай падрыхтоўкі практыкантаў.

І. КРЫМАЎ.



Дзяўчаты матфака кансультуюцца перад здачай экзамена.

Ардэнаносны Універсітэт — 50 годаў Савецкай улады

ДНЯМІ пад старшынствам члена-карэспандэнта АН БССР прарэктара па навуковай рабоце В. І. Сцяпанава адбылося чарговае пасяджэнне універсітэцкай камісіі па дастойнай сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады. Былі заслуханы спаваздачы некаторых дэканаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый аб ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў.

На пасяджэнні адзначалася, што ў многіх галінах дзейнасці наш ардэнаносны універсітэт цвёрда трымае слова, дадзенае радзіме. З моманту прыняцця абавязацельстваў вучонымі выканана вялікая навукова-даследчая работа, вынікі якой укараняюцца ў вытворчасць, значна палепшыўся вучэбны працэс, вышэй стаў узровень палітычнага выхавання моладзі і культурных мерапрыемстваў. На фізічным факультэце, напрыклад, ужо абаронена дзесяць кандыдацкіх дысертацый, а адзінаццаць падрыхтаваны і будуць абараняцца восенню. Супрацоўнікамі факультэта выдадзен шэраг цікавых манаграфій і распрацавана нямала новых лекцыйных спецкурсаў. Гаворачы аб выкананні мерапрыемстваў па падрыхтоўцы моладзі, трэба адзначыць ролю выкладчыкаў у арганізацыі выдатнай дзейнасці школы юных фізікаў. Апошняя цяпер карыстаецца вялікім поспехам не толькі ў Мінску, але і ва ўсёй рэспубліцы. Дакладваючы аб гэтых і іншых фактах, намеснік дэкана А. А. Лабуда запэўніў рэктарат і партыйную арганізацыю універсітэта, што працавіты калектыў фізфака не толькі выканае але і перавыканае свае абавязацельствы.

Нядрэнныя вынікі ў выкананні сацыялістычных абавязацельстваў і ў калектываў іншых прыродазнаўчых факультэтаў. Аб гэтым падрабязна гавалі дэкан біяфака П. Р. Пятровіч, намеснік дэкана хімфака В. П. Цікавы, дацэнт М. Я. Рэзнікаў і іншыя. На біялагічным факультэце сістэматычна абмяркоўваюцца выкананні мерапрыемстваў, прычым дэканат і партбюро не абмяжоўваюцца аналізам спраў, але і паўсядзённа дапамагаюць камісіям і асобным супрацоўнікам узорна выконваць тое ці іншае заданне. А на хімфаку выявілася, што такога кантролю яшчэ няма. Гэта прыводзіць да асобных упушчэнняў. Так, напрыклад, В. П. Цікавы не мог запэўніць камісію, што хімфак выканае абавязацельствы па падрыхтоўцы кандыдатаў навук.

ВЫКАНАННЮ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ — ПАЎСЯДЗЁННЫ КАНТРОЛЬ

Бягучы навучальны год быў вельмі ўраджайным па падрыхтоўцы навуковых кадраў і выданні кніг для філалагічнага факультэта. Як паведаміў У. М. Лазоўскі, з кніг, выдадзеных за апошні час вучонымі факультэта, можна скласці цэлую бібліятэчку. Многія аспіранты паспяхова завяршылі работу над кандыдацкімі дысертацыямі, гатовы доктарскія дысертацыі ў І. Я. Навуменкі, А. А. Лойкі. Блізка падышоў да завяршэння свайго даследавання М. Я. Цікоцкі.

Паспяхова выконваюцца абавязацельствы калектывам кафедры філасофіі і логікі. Загадчык прафесар І. М. Лушчыцкі далажыў камісіі, што, як і намечана абавязацельствамі, на кафедрах падрыхтавана 7 кандыдацкіх дысертацый. Прычым дзве з іх ужо абаронены, а астатнія прыняты вучонымі саветамі. Калектыў падрыхтаваў шэраг манаграфій. Нядаўна на кніжных паліцах мы ўбачылі дапаможнік па навуковаму атэізму. Па тым, як хутка яго куплялі, можна меркаваць аб якасці гэтай кнігі.

На пасяджэнні прыводзіліся і іншыя радасныя факты і прыклады. Разам з тым адзначалася, што партыйныя арганізацыі і дэканаты павінны ўзмацніць кантроль за выкананнем сацыялістычных абавязацельстваў. Юбілейная камісія рэкамендавала факультэцкім камісіям часцей заслухоўваць справаздачы асобных супрацоўнікаў, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі з тым, каб своечасова прысці ім на дапамогу, падтрымаць іх ініцыятыву, хутка распаўсюдзіць тое ці іншае новае пачынанне. Засталося некалькі месяцаў да свята, і, улічваючы, што з іх многа часу выпадае на канікулы, патрэбна ўзмацніць арганізатарскую работу, каб дастойна сустрэць юбілей. Дарэчы, на пасяджэнні камісіі аб юбілейным афармленні карпусоў выступіў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанаў. З яго слоў можна было заключыць, што многія факультэты яшчэ недастаткова ўдзяляюць увагі гэтай важнай справе. Тут таксама трэба падцягнуцца і кафедрам, якія павінны і могуць ярка адлюстраваць і сваю гісторыю, і свае поспехі.

Паспяховае выкананне сацыялістычных абавязацельстваў да юбілею—гэта доўг кожнага выкладчыка, студэнта. Да гэтага заклікае універсітэцкая камісія, увесь калектыў.

М. РУБНІКАЎ.

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Поўным ходам ідзе прыём новага папаўнення студэнтаў на завочную форму навучання ў наш універсітэт. Сотні калгаснікаў, рабочых, служачых розных устаноў прыехалі да нас, каб паспяхова здаць уступныя экзамены і паступіць на вучобу ў ардэнаносны БДУ. Важнай асаблівасцю прыёму студэнтаў у гэтым годзе з'яўляецца адкрыццё новых аддзяленняў. Гэта сведчыць аб тым, што Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праяўляюць неаслабныя клопаты аб развіцці навукі і культуры ў нашай краіне.



Фота А. Кадзета.

ІДЗЕМ ДА КАСТРЫЧНІКА

Заканчваецца сесія. Многія студэнты і выкладчыкі сталі рыхтавацца да летніх канікулаў. Але ў нашым універсітэце ёсць такая катэгорыя людзей, у якіх ніколі не бывае канікул — гэта лектары, энтузіясты, якія нясуць слова партыі ў масы, натхняючы іх на новыя падзвігі. Наш карэспандэнт звярнуўся да старшыні універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» дацэнта М. Я. Рэзнікава з просьбай расказаць аб дзейнасці лектараў у мінулым годзе.

— Для нас гэты год, — паведаміў Матвей Якаўлевіч, — вельмі напружаны і разам з тым радасны. У сувязі з ростам зацікаўленасці да гісторыі савецкай дзяржавы, Камуністычнай партыі і нашай сучаснасці кожны з членаў універсітэцкай арганізацыі імкнецца часцей выступаць перад насельніцтвам, паўней задавальняць яго духоўныя запатрабаванні. У гэтым навучальным годзе прачытана звыш семсот лекцый і дакладаў, з іх палова па юбілейнай тэматыцы.

Важнае месца займаюць у нас кастрычніцкія чытанні і ў самім універсітэце. Яны арганізаваны на ўсіх факультэтах. Характэрна, што па праграме выступаюць вядучыя вучоныя краіны, актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыі і Айчыннай вайны, знатныя людзі.

Мы рады і задаволены сваёй працай, таму што ў юбілейным годзе паявілася шмат новых форм і метадаў прапаганды. Ужо традыцыйнымі ў дзейнасці нашай арганізацыі сталі калектыўныя выезды лектараў на фабрыкі і заводы, у вайсковыя падраздзяленні. Па пяць-шэсць такіх брыгад за апошні час пабывала на аўтазаводзе, на заводзе імя Кірава і завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, у Слуцку, Слоніме і іншых раённых цэнтрах нашай рэспублікі. Аб тым, як ацэньваюцца такія выезды, сведчаць падзякі прадпрыемстваў.

Вялікай папулярнасцю на факультэтах карыстаюцца арганізуемыя намі сустрэчы са знатнымі людзьмі і тэматычныя вечары. У гэтым навучальным годзе іх было чатырнаццаць. Трэба назваць і такую форму нашай работы, як лекцыі-канцэрты. Гэта своеасаблівыя мантажы асобных нумароў мастацкай самадзейнасці, звязаныя паэтычным расказам аб тых этапах, якія прайшла наша краіна за 50 год. Пачынальнікамі жыццядзейнасці гэтай формы былі студэнты-філолагі. Яны і цяпер актыўна ўдзельнічаюць у рабоце таварыства. Нарэшце дапоўню, што ў дапамогу лектарам выдана 20 брашур, а ў кнізе «Гутаркі аб прыродзе і грамадстве» з 20 артыкулаў 11 належаць нашым аўтарам.

Лектараў чакае цікавае лета. Лекцыйную прапаганду будуць весці студэнты і выкладчыкі ў многіх раёнах Беларусі, на цаліне, на будоўлях Сібіры і нават за межамі нашай рэспублікі. Я маю на ўвазе тых, хто выязджае ў Чэхаславакію, Польшчу і ГДР. Пройдуць два месяцы, і мы зможам падвесці вынікі іх змястоўнай і вельмі неабходнай працы.

У заключэнне Мацвей Якаўлевіч праз нашу газету перадае шчырую падзяку лектарам за іх працу ў юбілейным годзе і жадае новых поспехаў на час летніх канікулаў.

АТРАДЫ СФАРМІРАВАНЫ

Кожны год на перыяд летніх канікул студэнты нашага універсітэта едуць працаваць на цаліну, у Сібір, на Поўнач, у братнія сацыялістычныя рэспублікі, але яны разумеюць, што працоўная рамантыка заключаецца не толькі ў тым, калі паедзеш за «тры-дзевяць зямель», а таксама тут, у сябе дома. Таму не дзіўна, што многія з іх застаюцца працаваць у Мінску, ці на будоўлях Беларусі. Для нашых працалюбівых студэнтаў галоўнае не адлегласць, а праца. Толькі была б карысць Радзіме.

У гэты юбілейны год свае поспехі ў працоўным семестры студэнты прысвячаюць 50-годдзю Савецкай улады. На факультэтах праводзяцца сходы, на якіх студэнты сумесна намячаюць планы на лета. Дыбрым прыкладам можа паслужыць сход цаліннікаў на фізічным факультэце, дзе было выказана шэраг карысных прапаноў, намечаны канкрэтныя мерапрыемствы. Цаліна не за гарамі, і гэта вельмі правільна, што пра яе ў штабах працоўных спраў факультэтаў вядуць пастаянна размову.

На будоўлі і прадпрыемствы Беларусі паедзе вялікі атрад студэнтаў, які налічвае у сваім складзе каля тысячы чалавек.

Не раз добра праяўлялі сябе студэнты універсітэта на будоўлях Мінска. Вось і ў гэтым годзе, напрыклад, будтрэст № 15 папоўніцца сотняй дужых і працалюбівых юнакоў і дзяўчат. Большасць з іх—людзі, якія маюць будаўнічыя спецыяльнасці. Яны з радасцю возьмуць у рукі кельмы, малаткі пасля дзесяцімесячнага перапынку ў фізічнай працы.

Хутка будуць выходзіць з канвеера аўтамабільнага завода «Мазы», да якіх будуць прыкладзены рукі і нашых студэнтаў: яны ж будуць працаваць тут летам.

Вельмі многа дапамаглі студэнты ў будаўніцтве хімічнага корпуса. У гэтым годзе яны таксама ў складзе 25 чалавек, будуць завяршаць тут работы. 60 чалавек прымуць удзел у будоўлі студэнцкага інтэрната.

І гэта не ўсё. Студэнты універсітэта разам з будаўнікамі зробяць каштоўны падарунак піянерам Беларусі — піянерскі лагер «Зубронак». З іх дапамогай будзе ўзводзіцца і гасцініца «Юнацтва».

Новыя фермы, клубы ў калгасах і саўгасах нашай рэспублікі будуць пабудаваны таксама рукамі студэнтаў БДУ.

Вядома, усё гэта лёгка пералічыць, але нялёгка здзейсніць. Як паказала практыка мінулых гадоў, не на ўсіх будоўлях студэнцкія брыгады былі забяспечаны неабходнымі матэрыяламі. Вядома, ўсе гэтыя недахопы выказваліся на выпрацоўцы.

Што ж датычыцца студэнтаў, яны з аганьком возьмуцца за кожную справу. Дайце ім толькі яе.

Л. КАЗІНЕЦ.

ГЭТА ЎСЁ ДЛЯ БУДУЧАГА

СА СВЯТОЧНЫМ ВІЗІТАМ

Віктар Поляк і Уладзімір Гулевіч — студэнты нашага універсітэта ў мінулым годзе, як і многія іншыя, правялі працоўны семестр у братняй Чэхаславакіі. Яны разам са сваімі таварышамі дружна працавалі на будоўлях поплеч з чэхамі і славакамі. Гавораць, што людзі, у якіх аднолькавыя мары, імкненні, неяк аб'ядноўваюцца адзіным інтарэсам, старанна працуюць, зайсёды жывуць у дружбе.

Многа ўражанняў прывезлі нашы студэнты з братняй Чэхаславакіі. Бывала, сядзім да апоўначы ў інтэрнаце і слухаем расказы пра жыццё і вучобу чэхаславацкіх студэнтаў, пра курорт Карлавы Вары, пра аўтамабільны завод Шкода... Слухаем, а ў саміх з'яўляецца такое пачуццё, нібы мы самі там пабывалі. Вельмі ж западаюць у душы такія гутаркі.

І вось сёлета пачынаецца працоўны семестр— 67 года. З нецярпеннем чакаюць нашы студэнты адыходу цягніка ў Чэхаславакію, Польшчу і ГДР.

Магчыма ўжо не раз перагортвае ліставы календара дырэктар саўгаса «Цепла», дзе працавалі нашы студэнты, Іосіф Гона і думае:

— Хутчэй бы яны ўжо прыехалі, з імі так добра працаваць... Выдатныя рабяты...

Гэты дзень прыйдзе, прыйдзе вельмі хутка. Зданы экзамены, названы імёны «шчаслівых». Не сёння — заўтра развітаюцца яны на два месяцы з родным універсітэтам, Мінскам.

І БАБІЧ.

ЛЯ ФІНІША

Усяго толькі адзін экзамен раздзяляе студэнтаў гэтай групы чацвёртага курса хімічнага факультэта ад трэцяга працоўнага семестра. Апошні экзамен 24 чэрвеня. А цяпер пакуль што ідзе экзамен па каларыдзіцкай хіміі, які прымае дацэнт Ф. М. Капуцкі. Экзамен не з лёгкіх. Але студэнты, якія выходзяць з аўдыторыі, усхваляваныя і радасныя, трымаюць у залікоўках новыя пяцёркі і чацвёркі. З'явіліся яны і ў Жэні Шэрэмет, Ларысы Сяўрук, Люды Мельгуй, Яўгена Квасюка, Маргарыты Ляхавай. Гэтыя студэнты паспяхова здаюць не толькі каларыдзіцкую хімію, поспех спадарожнічае з імі на працягу ўсёй сесіі, на працягу ўсіх чатырох гадоў вучобы. Калі ж гаварыць увогуле аб групе, то трэба адзначыць, што яна праз год будзе заключаць у сабе высококваліфікаваных спецыялістаў—хімікаў, якіх з нецярпеннем ужо цяпер чакаюць школы, фабрыкі, заводы.

С. КАРАМІН.

КАЛІ Іван Качур адказаў на экзаменацыйны білет па гісторыі старажытнай рускай літаратуры, выкладчык дацэнт Язэп Васільевіч Зазека пацікавіўся, дзе ён працуе. Гэтае пытанне было зададзена не проста дзеля цікавасці. Тут іншае — цеснае знаёмства са студэнтамі і своеасаблівае сацыялагічнае даследаванне.

Вядома, многія скардзяцца, што ім, вячэрнікам, вельмі цяжка працаваць і вучыцца. У кожным выпадку многія з іх спасылаюцца ў першую чаргу менавіта на гэтую прычыну.

— Я працую інжынерам па тэхніцы бяспекі ў медыцынскім інстытуце, — адказвае Іван.

Многія, магчыма, і не ведалі, што ў яго за плячыма нялёгкі шлях жыцця.

У Івана нядрэнная спецыяльнасць — інжынер, але яго вабіць, акрамя гэтага, і журналістыка. Дарэчы, пісаць матэрыялы ў перыёдыку Іван пачаў яшчэ ў час службы ў радах Савецкай Арміі.

Экзамен па гісторыі старажытнай літаратуры ён здаў на добра.

Першай «каралевай» на экзамене была Яўгенія Галюгіна. Выкладчык асабліва не здзівіўся выдатнаму адказу на ўсе пытанні дзяўчыны, бо ёй, як бібліятэкару сорамна не ведаць літаратуры. У душы ён толькі шчыра павіншаваў дзяўчыну.

Юрый Бокач і Юрый Сысоеў яшчэ маладыя хлопцы, у іх наперадзе ўсё жыццё, але і яны ўжо могуць ганарыцца тымі поспехамі, якіх дабіліся ў творчай працы. Па спецыяльнасці абоє яны журналісты. Дакладна тлумачыць на пытанні Юра Бокач, не горшым адказ быў і Юры Сысоева — заслужаныя «выдатна».

Прыкра было адчуваць на фоне такога выдатнага настрою на экзамене слабыя веды студэнткі Г. Пяткевіч, тым больш, што яна перавялася са стацыянарнай формы навучання на вячэрнюю. Вячэрнікі лепш за яе адказваюць. Яна не ведала элементарных пытанняў курса, таму атрымала двойку.

Выкладчык тлумачыць мне:

— Відаць тут ёсць мая віна (на яго твары я не мог не заўважыць пачуццё гумару). Уявіце сабе. На стацыянары на старажытную рускую літаратуру адведзена толькі 36 гадзін у той жа час, як на вячэрнім 60 [!]. На стацыянары здаюць залік, а тут — экзамен. Не вядома, чаму іменна так вырашыў Вучоны савет!..

Хочацца і нават трэба зрабіць папрок у адрас некаторых студэнтаў першага курса за слабае веданне прадмета і малой начытанасці.

Напрыклад, Г. Рэзнікавай трапіў не такі ўжо і «цяжкі» білет. Пытанні ў ім: «Павучэнне Уладзіміра Манамаха» і «Камедыя Капніста «Ягада». Прасцейшыя пытанні, але адказаць на іх, колькі ні сілалася Рэзнікава, так і не змагла. У час дапаўняльных пытанняў яна іншы раз кідалася ў такія недарэчнасці, што станавілася сорамна за тое, што здае экзамен студэнт аддзялення журналістыкі. Хіба можна сказаць, што Уладзімір Манамах у сваіх «Павучэннях» ужываў такую фразу, якая ўзнікла толькі ў дваццатым стагоддзі: «...улічваць патрэбы працоўных»! На пытанне, дзе і калі было надрукавана «Павучэнне» Уладзіміра Манамаха Г. Рэзнікава адказала, ці то ў XIV ці ў XIX стагоддзі...

Пра студэнтку гэтага курса Людмілу Зданюк нядрэнна адзываюцца яе сяброўкі. Вучыцца яна добра. Акрамя таго, у яе ёсць спартыўныя заслугі — майстар спорту па акрабатыцы. Нядаўна ёй трэба было паехаць на спаборніцтвы. Экзамен вырашыла здаваць датэрмінова. Не здала. Зразумела, ёй было цяжка. Але хіба вінаваты ў гэтым выкладчык! Вось кароткая размова Л. Зданюк з Язэпам Васільевічам па тэлефону: Людміла Зданюк: — Я Вас выклікала, дзе вы былі?..

Пазваніце па нумару (...), я прыду.

Зазека: — Пакуль яшчэ закона такога няма, каб выкладчык званіў ці прыходзіў да студэнта. Выкладчык адзін, а студэнтаў шмат...

Студэнты задаволены выкладчыкамі, якія робяць ўсё, каб яны былі высокаадукаванымі, культурнымі, добрымі спецыялістамі. І вельмі ўдзячны ім. Але самай высокай падзякай тут могуць быць толькі добрыя веды, добра напісаныя ў газеце нарысы, замалёўкі, інфармацыі, рэпартажы.

Мы гаварылі пра першы курс журфака, пра адзін з экзаменаў гэтай сесіі. Пра вучэбныя «кантрасты».

Застаецца толькі давесці гутарку да канца. Гэты экзамен характэрна адлюстроўвае тое, што за веды трэба змагацца. Вынікі па старажытнай рускай літаратуры такія: выдатна — 5, добра — 11, здавальняюча — 14, нездавальняюча — 4.

Зразумела, вячэрнікам цяжка займацца, але патрабанні ад гэтага не зніжаюцца. Будучым спецыялістам неабходны глыбокія веды.

М. ЗАБАРОНАК.

ВЯЛІКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Закончыліся дзяржаўныя экзамены ў студэнтаў-завочнікаў шостага курса факультэта журналістыкі. Праз некалькі дзён яны атрымаюць дыпломы.

— Я вельмі задаволены, што дажыў да такога часу, калі здзяйсняюцца мае мары. Я закончыў факультэт журналістыкі, — гаворыць нам Пятро Суцько.

Так, прайшло шэсць гадоў напружанай вучобы. Каму ж не будзе прыемна ад гэтага. І, менавіта, дыплом для завочніка — гэта вялікая ўзнагарода.

Пятро ўспамінае ўсе гады вучобы. Першы курс, другі... шосты. Яму нялёгка было рыхтавацца да сесій, пісаць кантрольныя работы. Але жаданне заўжды перамагала. Працуючы ў раённай газеце, ён адчуваў, як узрасталі яго духоўныя запатрабаванні да жыцця. І ўсё гэта дзякуючы працы і вучобе. Цяпер смела можна гаварыць пра Пятра Суцько і такіх выпускніках, як Аляксей Агафонаў, Іван Гусеў, Мікалай Вырскі і Генадзь Навасёлаў, што яны будуць дастойнымі журналістамі, бо акрамя тэарэтычных ведаў у іх ёсць пэўны вопыт у практычнай рабоце.

Тут яшчэ важна адзначыць, што на апошнім дзяржаўным экзамене па гісторыі бальшавіцкага друку яны паказалі добрыя веды. Застаецца іх толькі павіншаваць, пажадаць выдатных поспехаў у творчай працы.

Л. КЛІЧКО.

СТУДЭНТ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА

О, гэтае першае здзіўленне! Першае пачуццё! Першае... Першае...

...Мы ляжым на саломепацярусе, толькі што прывезенай на саманную пляцоўку, і чакаем вадавоза. Паблізу стаяць валы, ляніва памахваючы хвастамі. Спякота. Сонца ў блакіце. У стэпе маўкліваць, цішыня.

Гена Бязладнаў, нацягнуўшы на вочы белы шыракаполы капялюш, не то размаўляе, не то думае ўслух.

— Гэты маленькі прынц быў надзвычайна кемлівым хлопцам. Калі кожны прыбярэ сваё месца, наша планета будзе чыстай.

— Азы пазнаеш, юнак. Выдатна, — жартаўліва гладзіць яго па галаве Валерка Часнакоў і павучальна дадае, — Экзюперы цяпер у модзе. Так што лічы сябе на грэбні.

— Калі збоку глядзець на вас, дык адразу ўспамінаеш размову паміж Сакратам і Федрам, — усміхаецца Генрых Далідовіч. — Для поўнай карціны не хапае «Лёгкага подыху ветрыка, падпяваючага хору цыкад, і раскошнай муравы».

— Крыху ўяўлення і гэты недахоп скампенсуецца, — ажывіўся хтосьці. Цыкад з поспехам заменяць суслікі, мураву — перакаці-поле...

На працілеглага боку саломы — другая тэма.

— Канешне, гэта ўсё ўмоўна, але нейкая аналогія

— Канешне, гэта ўсё ўмоўна, але нейкая аналогія ёсць. Ну, існуе твая элементарная часцінка ў касмічных промнях, ці яшчэ дзенебудзь. Ніхто аб ёй не ведае, маўчыць і яна. І вось бяруць яе, змяшчаюць у цыклічна-рэзанансны выпрабавальнік. У выніку — новыя якасці. Возьмем цалію. Тут таксама горача. І ты з такой хуткасцю носішся па аб'ектах, што ёй, я думаю, становіцца зайздросна ў сваім сінхрафазатроне. А гоніць цябе напружанне, якое спадае толькі ў канцы жніўня. У друку скажуць так: «Скончан яшчэ адзін працоўны семестр».

— Едзе!!..

Прагучаўшае слова раўнавага камандзе «пад'ём». Усе усхоплівацца са сваіх месц.

Па стэпе, узнімаючы фантастычныя воблакі пылу, імчыць «Урал-Газ». Вада. Значыць зноў закіпіць работа.

— Змагаецца са стыхіяй у Кардыльерах Антуан Экзюпюры...

— Застаецца невядомым, чаму легендарныя багі казачнага Алімпа не ідуць ні ў якое параўнанне з цяперашнімі гаспадарамі блакітнай планеты...

— Гена і Валера накіроўваюцца да валоў і лезуць з імі ў самае «пекла».

На ўскапаную глебу — суглінак ляціць салома, льецца вада падаюць буйныя кроплі поту. Усе гэта пермешваецца чатырмя парамі ног жывелы і двумя парамі ног студэнтаў.

— Па арбіце, па арбіце, міленькі...

— Ах! Каб ты здох...

Гразь ляціць ва ўсе бакі. Хлюпае, дрыжыць балота. Раз за разам, захапіўшы ў перапэцканыя рукі згусткі замесу і пацершы ўшы яго, хто-небудзь коратка кіне: «Яшчэ крыху».

А там, дзе ўжо раствор прыгатаван, рабяты не марудзячы хватаюць яго віламі, лапатамі, а то і проста рукамі і рупліва запаўняюць ім формы. Паўзуць і паўзуць ад замесу акуратныя цаглінкі-саманіны. Іх трэба многа, гэтых саманін, каб хапіла і на кароўнік, і на кашары, і на майстэрню, і на дом, які будуецца сярод голага стэпу...

...Я сустракаюся з імі, рабятамі-фізікамі, амаль кожны дзень на вуліцах горада, у тэатры, у сталовай, бібліятэцы. Мы паціскаем адзін другому рукі, пытаемся, як справы. У залежнасці ад іх стану— адпаведны настрой. А настрой у іх заўсёды прыўзняты.

— Дык вось, ведаеш, выношваю ўсё тую ж ідэйку. Цяпер ужо здагадваюся: стварацца веласіпед. Лячу, браце, на ўсіх хуткасцях прама ў тупік. Выйгрыш толькі ў часе, калі, дапусцім, параўноўваць з пешаходам. Карпенка на кавалку бумагі малюе графік, тут жа выпісвае формулы. Для мяне яго сімвалічныя знакі — егіпецкая грамата. Я толькі ўнутраным пачуццём здагадваюся, што за імі стаіць канкрэтны сэнс і яго, Віталя Карпенкі, пошук. Ён і сам заўважае маю бедную пасведчанасць у пытаннях вышэйшай матэматыкі. Не адыходзіць жа ён ад мяне, адразу кінуўшы размову аб сваёй «ідэйцы», таму што бачыць, з якім жаданнем я хачу зразумець яго, што мне вельмі і вельмі хочацца, каб ён, мінуўшы тупік, адкрыў нешта новае незвычайнае!

...Замыславатае перапляценне правадоў, прыборы розных памераў. Аловак, папера. Віктар Батыраў, высокі разважлівы хлопец, дрыжачымі ад хвалявання рукамі ўключае тумблер. На сятчатым экране асцылографа з'яўляецца зеленаватая кропка. Паварот адпаведных рычажкоў — і кропка ператвараецца ў гарызантальную лінію, затым яна нібы пераломліваецца, і вось ужо на экране вычэрчваюцца хвалепадобныя ваганні электрычнага току. Выканана першае, самае простае заданне. І першая, ні з чым не параўнальная радасць.

...У чытальнай зале бібліятэкі за сталом, на якім узвышаюцца кіпы даведнікаў, вучоных запісак, падручнікаў працуе над дыпломнай Павел Жмакаў. Яго адкрыты лоб то хмурнее, то становіцца светлым. Хуткае пяро гэтак жа паслухмяна і ўпэўнена лепіць радок за радком, як кельма. Абстрактныя паняцці знаходзяць канкрэтнае выражэнне ў слупках паслядоўных і строгіх разлікаў. Павел увесь у асяроддзі ўмоўнасці. Ён не заўважае, як у зале паступова тухне святло, як побач устаюць і выходзяць з-за стала іншыя студэнты. Нарэшце ён падымае галаву, і ў яго вачах адбіваецца здзіўленне, дакор, роспач. Здаецца, што яму перашкодзілі ў самы апошні момант знайсці тое, самае-самае... Такое адбудзецца і заўтра, і паслязаўтра, і праз месяц, і пасля абароны дыпломнай. А можа (хто ведае!) дагадка ўзнікне раптоўна, быццам ток. І грудзі выдыхнуць легка і горда,—знайшоў!

...Маленькі пакой у студэнцкім інтэрнаце. Каля ложка маленькая калыска. А ў ёй маленькі-маленькі чалавек. Оля Кучынская. Оля глядзіць на маці і на кнігу, якую яна трымае ў руцэ. «Што цікавей? — думае Оля, — напэўна, кніга: нездарма ж мама аддае ёй перавагу».

Оля не ўмее гаварыць. Яна працягвае свае кволенькія ручкі, але мама не бачыць: яна чытае. Оля крывіцца, паціхеньку пачынае хныкаць. Калыска закачалася. Не. Не гэта! Тварык чырванее. Вочкі пільна сочаць за кнігай —і... (ах, імгненне!) — «Дай!».

Была б у маці не «тэорыя адноснасці» Эйнштэйна, а самыя натуральныя ключы ад сусвету, яна б тут жа, не вагаючыся, перадала ёй.

— Дачушка ты мая! — шэпчуць шчаслівыя губы маці і цалуюць, цалуюць маленькую Олю.

Прыдзе вечарм з завода тата (у яго цяпер вытворчая практыка), і Ванда падрабязна раскажа яму, як Оля сказала сваё першае слова.

Першае слова... Першая радасць... Першая... Першая...

В. ПОЛЯК.



Пошукі... пошукі — у іх заўсёды знаходзяцца студэнты фізфака.

Фота Ул. Старчанкі.

МЫ ВЕРНЕМСЯ, НАРАЧ!

Нарач! Жамчужына беларускай прыроды, цудоўнейшы куток роднай зямлі! Амаль дваццаць гадоў назад упершыню заснаваліся тут студэнты нашага універсітэта. Спачатку яны ператварылі возера і яго ваколіцы ў сваю лабараторыю, а затым выбралі яго і месцам для адпачынку. У мінулым годзе універсітэцкі студэнцкі спартыўна-аздараўленчы лагер на возеры Нарач адзначыў дзесяцігадовы юбілей.

Больш чатырохсот юнакоў і дзяўчат правялі тут свае мінулыя летнія канікулы. Рэктарат і грамадскія арганізацыі універсітэта робяць усё магчымае, каб умовы для адпачынку студэнтаў з кожным годам паляпшаліся, каб як мага больш студэнтаў мелі магчымасць тут адпачыць.

І лепшым доказам таго, што моладзі тут падабаецца, з'яўляецца бясконцы паток заяў, якія пачынаюць паступаць ужо вясной. Студэнты-замежнікі, якія пабывалі пасля падрыхтоўчага факультэта і навучаюцца ў розных гарадах краіны, прысылаюць пісьмы з просьбай прадаставіць ім магчымасць правесці летнія канікулы ў лагеры на Нарачы.

Не доўгае ты, студэнцкае лета. Нават для тых, хто прабыў у лагеры дзве зменьі, 48 дзён, поўных сонца, радасці ,вяселля, маладога задору і студэнцкай шалаўлівасці, яны праляцелі зарэльмі ўжо хутка. Праляцелі, але аставілі мноства добрых успамінаў, добрых знаёмстваў і незабыўных уражанняў.

Адны ўспамінаюць удзел у водна-спартыўным святе, арганізаваным моладдзю Мядзельскага раёна. Цёпла і сардэчна сустракалі хлебаробы выступленні студэнтаў нашага універсітэта. Асабліва прыветна яны прынялі пасланцоў гераічнага народа В'етнама, якіх доўга не адпускалі, засыпалі пытаннямі, радушнымі запрашэннямі прыехаць да іх у госці.

Другія ўспамінаюць сустрэчы з літоўскімі сябрамі з Каунаскага політэхнічнага інстытута. Тут і спартыўныя спаборніцтвы, у якіх перамагалі дружба і гасціннасць, і неафіцыйны конкурс на лепшае выкананне народнай песні, і славутасці Каунаса і Вільнюса, і прыгажосць Тракайскага замку. А хіба можна не запамятаць прагулкі на яхтах па Каунаскаму водасховішчу ці традыцыйныя кастры адкрыцця ў лагеры універсітэта і ў лагеры літоўскіх калег, дзе студэнты універсітэта прысутнічалі ў ролі гасцей... І песні, песні, песні...

Трэцім успамінаецца незабыўнае свята Нептуна, прысвечанае Дню Ваенна-Марскога Флоту СССР. Многім тады папала ад грознага «марскога ўладыкі» за нядбайнасць, пасіўнасць, непаслушэнства. У «марскую купель» кідалі ўсіх. Толькі некаторым з віноўнікаў удалося пазбегнуць расплаты. І гледзячы на фатаграфіі, яшчэ доўга будуць успамінаць непасрэдныя ўдзельнікі свята і гледачы, як заўгаса «дзядзьку Яшу» за дрэннае забеспячэнне адбуксавалі на маторнай лодцы і аставілі без вёсел далёка ад берага, як вылазілі мокрымі з вады намеснік начальніка лагера і старшыня лагернага савета...

Блакітныя азёры... Гэта сказачныя пейзажы з азёрамі, пакрытымі чароўнымі кветкамі белых лілій, з вялізнымі ўзгоркамі, парослымі лесам, дзе многагалоса і раскаціста з усіх бакоў адклікаецца рэха, з імклівымі рэчкамі, якія цякуць праз густыя цёмныя лясы. Гэта чорныя ад ягад раты і завязаныя вузлам рубашкі, поўныя адмысловых, самых белых у свеце грыбоў. Гэта і харство турысцкіх кастроў, і задушэўнасць лірычных песень пад гітару, калі усё навокал становіцца непаўторна цудоўным і калі пачынаеш рэальна адчуваць значэнне слоў «родны», «радзіма», «любоў»...

Суровым абвінавачваннем чалавеканенавісніцкай палітыкі амерыканскага ўрада прагучаў у адзін з вечароў праўдзівы расказ студэнта з В'етнама Нгуен Чонг Біня пра мужную барацьбу яго народа і аб злачынствах, якія учыняюць інтэрвенты ў гэтай маленькай гераічнай краіне.

Студэнтам з Кубы больш за усё запамяталася святкаванне гадавіны 26 жніўня і тэматычны вечар «Рытмы і мелодыі Кубы». Многа сіл і энергіі патрацілі яны на падрыхтоўку гэтых вечароў, якія прайшлі з вялікім поспехам.

Цікавы вечар падрыхтавалі і самалійскія студэнты. Яны пазнаёмілі гледачоў, якія сабраліся амаль са ўсяго пабярэжжа, з гісторыяй вызваленчай барацьбы сваёй краіны, з традыцыйнымі звычаямі, з народнымі песнямі і танцамі. Уся зала падпявала ім тады: «Самалія, Самалія...» А Абдулкадыр Юсуф Херсі, юнак невялікага ўзросту, з цудоўным прыветным тварам і задорнымі, але добрымі вачыма, пад гром апладысментаў быў двойчы на ўрачыстым закрыцці першай і другой змены, узнагароджан падарункамі і граматамі камітэта камсамола універсітэта за актыўны удзел у жыцці лагера.

Дружнай, брацкай сям'ёй жылі ў лагеры пасланцы В'етнама і Кубы, Самалі і Ганы, Верхняй Вольты і Каралеўства Бурундзі, Танзаніі і Кеніі. Плячо к плячу з беларускімі хлопцамі працавалі яны ў сталовай і на загатоўцы дроў, разам гралі ў зборных камандах лагера, спявалі савецкія песні і развучвалі любімыя танцы.

Вясёлыя і бадзёрыя, да чарнаты загарэлыя юнакі і дзяўчаты садзіліся ў аўтобусы.

І няхай многія з іх выязджалі адгэтуль назаўсёды, але ў думках яны гаварылі, развітваючыся з возерам, з лагерам, з новымі сябрамі: «Мы абавязкова вернемся, Нарач! Мы ніколі цябе не забудзем».

В. МУХАЕУ.
В. БУДАЙ.

ЗВІНІЦЬ ПІЯНЕРСКАЕ ЛЕТА

Піянерскае лета. Перапоўнены дзіцячымі галасамі лагеры. І не толькі дзіцячымі. Сярод піянерважатых мы ўбачым студэнтак філалагічнага факультэта Тамару Толсцікаву, Тамару Нуждзіну, Любу Юрашэвіч. Выхаванне дзяцей—іх першародная задача. Таму такая ўвага ўдзяляецца практыцы студэнтаў факультэта. Кожны год дзесяткі старшакурсінкаў накіроўваюцца ў школы, дзе яны вядуць урокі.

Дзень у лагеры пачынаецца з лінейкі, рапартаў камандзіраў дружын. Потым... потым спартыўныя гульні, экскурсіі, гутаркі, сустрэчы з вядомымі людзьмі краіны.

Піянеры любяць сваіх важатых, сваіх старэйшых сяброў. Ім хочацца «адкрыць» ім свае мары, хочацца падзяліцца ўражаннямі аб прачытаных кнігах, таму адказнасць у студэнтаў, якія працуюць піянерважатымі, вельмі вялікая. Акрамя таго, што яны павінны быць эрудыраванымі, яшчэ вельмі важна ведаць псіхалогію дзяцей. Перш за ўсё ў выхаванні значную ролю адыгрываюць уласныя паводзіны. Прыемна адзначыць, што студэнты нашага універсітэта, якія знаходзяцца ў піянерскіх лагерах, пачэсна спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Яны прыкладаюць шмат намаганняў да асваення таямніц педагогікі.

У гэтым годзе ў піянерскія лагеры будзе накіравана 300 студэнтаў універсітэта.

А. ЦЕРАХОВІЧ.

ПАСЛЯ ДРУГОГА СЕМЕСТРА

Сесія падыходзіць да канца. Гэта ўжо відаць па шчаслівым, бадзёрым настроі, які пануе на тварах тых, хто здаў апошні экзамен. У першакурснікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры А. Бруцкага, А. Бутэвіча, С. Дабрыян, Л. Бурш, Ю. Нагорнага, А Разанава, А. Розум гэты настрой своеасаблівы: другая сесія ва універсітэце пройдзена з поспехам, з поспехам закончан першы год навучання ў вышэйшай установе. І гэты першы год ім дае поўнае права лічыцца на курсе лепшымі.

І ўсё ж, калі гаварыць, што для іх навучальны год закончан, атрымаецца неяк ніякавата: напарадзе ж у студэнтаў яшчэ трэці семестр — працоўны. Ён будзе праходзіць на будоўлях краіны, у піянерскіх лагерах— у самых розных кутках, зусім далёкіх ад універсітэта. А. Нагорны, А. Бруцкі, В. Ярац, і многія іншыя будуць працаваць у Слуцкім раёне, А. Бутэвіч М. Швец — у Мінскім раёне, А. Разанаў — ва Уральскай вобласці.

Р. БАРКАНАЎ.

ДЫСПУТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

КУЛЬТУРА ВЫЗНАЧАЕЦЦА АДНОСІНАМІ Ў ГРАМАДСТВЕ

Неяк раз у тралейбусе я пачула цікавую рэпліку старога чалавека. Нехта з маладых нагрубіяніў яму, і ён сказаў: «Вось нашы дзяды і бабулі былі неадукаванымі, ды культурнымі, а цяпер усе адукаваныя, ды малакультурныя». Нягледзячы, здавалася б, на парадаксальнасць яго фразы, ён мае рацыю ў тым, што ўраўніваць адукацыю і культуру ніяк нельга. Адукацыя — гэта сродак для найбольш скорага і поўнага дасягнення культуры, але сама яна яшчэ не азначае культуры. Адукаваны, насычаны ведамі чалавек сядытады ўжывае яе для дасягнення сваіх вузкіх эгаістычных мэт. Ён некультурны. «Ножніцы» паміж адукаванасцю і культурнасцю чалавека асабліва адчувальна выяўляюцца ў нашым асяроддзі — у людзей, якія займаюцца разумовай працай. Таму, мне здаецца, вельмі правільна, што газета «Беларускі універсітэт» пачала гэтую дыскусію на сваіх старонках.

Усе гэтыя спрэчкі вакол знешніх паводзін і знешняга выгляду людзей, мне здаюцца, нікчэмнымі, мізэрнымі. Яны вядуцца вакол таго, што ўжо аджыло і не зможа дапамагчы нам у барацьбе за культуру.

У нашым грамадстве, вялікім чалавечым калектыве, спаяным адзінствам мэты, культура вызначаецца не ЗНЕШНІМІ паводзінамі чалавека самога па сабе, а характарам яго адносін да радзімы, працы, сяброў.

Мяне, напрыклад, непакоіць выраз «добры тон». Яго не было. Мы, людзі новай эпохі, эпохі пабудовы камуністычнага грамадства, ствараем яго. І хіба ў ТОНЕ справа? А. М. Горкі пісаў: «У нашай краіне выхоўваць — значыць рэвалюцыянізіраваць». З пункту гледжання асноўнага рэвалюцыйнага напрамку сучаснага жыцця мы павінны ацэньваць кожны ўчынак і кожную з'яву. І тады стане зразумелым: культурна гэта ці не культурна. В. Кажэўнікаў паказаў у якасці вобраза сучасніка П. Балуева ў аповесці «Знаёмцеся, Балуеў». Ён бывае нябрытым, голас у яго ахрыплы, і гальштук зусім на бок звернуты, але ж гэта і ёсць самы культурны чалавек нашага часу, таму што яго адносіны да працы і сяброўства, да будаўнікоў газапровада — сапраўды камуністычныя. Усё жыццё аддае ён любімай рабоце, адначасова ліючы мерай усіх рэчаў чалавека. Будучы чалавекапаклоннікам, ён будуе свае адносіны з людзьмі на бескарысных сяброўскіх адносінах. Ён паважае ў чалавеку таварыша па працы.

Культура ў нашым грамадстве выключае зайздрасць, паклёп, падман, дробезную няначвісць душэўнае махлярства.

Калі ў грамадскіх месцах людзі звяртаюцца адзін да аднаго фамільярна — «дзяўчына, «жанчына» ці «бабулька», справа не ў форме. Але яны непавважаюць таго, да каго звяртаюцца, не бачаць у ім свайго сучасніка, таварыша.

Справа не ў слове, а ў тым, што яно павінна азначаць сутнасць нашых адносін у грамадстве, дзе чалавек чалавеку сябра, таварыш і брат, дзе дробнаўласніцкія і эгаістычныя адносіны адзін да аднаго павінны быць выключаны.

Павел Карчагін насмешлівы ў адносінах да любімай раней дзяўчыны Тоні Туманавай. Ён жорстка парывае з ёю адносіны. Што гэта, некультурнасць? Не, вышэйшая форма культуры. Яна стала мяшчанкай, адышла ад грамадскіх інтарэсаў і замкнулася ў сваім мікраскапічным свеце. Павел праў, калі прама, недвудушна аб гэтым заяўляе. М. Астроўскі паказаў нам вобраз сапраўды культурнага чалавека. Той жа Павел, будучы прыкаваным да пасцелі цяжкай хваробай, дабіваецца, каб яго жонка паступіла вучыцца, каб яна прымала актыўны ўдзел у жыцці, хоць гэта і пагражае яму адзіноцтвам. Чалавек не павінен папіраць воляй другога дзеля сваіх асабістых інтарэсаў. Культура ў нашым грамадстве складваецца паміж яе членамі, мыслячымі па-камуністычнаму і паступаючымі па-камуністычнаму.

Дацэнт **Н. РАМАШКА.**

ПАДАРОЖЖА ПА ПРЫПЯЦІ



Нас было дзевяць чалавек. Усім захацелася праплыць па рацэ Прыпяць, пранікнуць на яе прыток Пціч...

Пачаткам нашага падарожжа быў цудоўны горад Палесся — Мозыр. Вядома, нас не суправаджала грамадскасць горада, не было ўрачыстых мітынгаў і аркестраў, як звычайна перад пачаткам падарожжа «мараходцаў». Мы на шасцівёсельнай лодцы «рушылі» па Прыпяці. Не было сярод нас ні капітана, ні лоцмана, бо нашай пасудзінай кіраваць было не так складана. Праўда, засынаў іншы раз ноччу днявальны, тады цячэнне ракі гнала нашу лодку назад, пакуль яна не ўпіралася ў прыбярэжны куст лазы. Тады мы хутка прачыналіся, налягалі на вёслы і паволі, але ўпэўнена адваёўвалі ў Прыпяці страчаную адлегласць...

За некалькі дзён такога падарожжа мы адплылі ад Мозыра ўсяго некалькі кіламетраў. Многія з нас згубілі ўсякую надзею ўглубіцца далей у жывапісны палескі абшар, бо кожны раз прачыналіся раніцай з думкай, дзе Мозыр?

Невядома, чым бы закончылася наша падарожжа, каб нам на дапамогу з «вялікай зямлі» не прыйшло падмацаванне. Аднойчы на нас ледзь-ледзь не наскочыла баржа, нашу пасудзіну пачало кідаць ад разэлаваных хваль, некаторых з нас яна, бы языком, так і злізала з «палубы». Мы ўсе хорам закрычалі: «Ратуйце!»...

На судне былі вельмі прыветныя людзі, Яны нас накармілі, аказалі медыцынскую дапамогу. Пад аховай нашых спасіцеляў мы без ніякіх турбот і асаблівых прыключэнняў дабраліся да ракі Пціч. І ноччу былі высаджаны ў «адкрытым моры», так выглядзела ў гэты час рака. Ноччу мы не адважыліся падыходзіць да невядомых берагоў.

Раніцай пачалі рухацца ўверх па рацэ. Два разы наш плыт пераварочвалі парогі, некалькі разоў ноччу садзіліся на мель, нацярпеліся з-за голаду, бо нашы прадукты недзе адпачывалі на дне Прыпяці...

Пасля двухмесячнага падарожжа мы прайшлі не адну сотню кіламетраў, але так і не дасягнулі вытокаў гэтай «вялікай» ракі. Не вытрымаўшы цяжкіх выпрабаванняў, мы павярнулі назад...

Мы думаем, што кожны з нас зразумее, не спалохаецца «цяжкасцей» пераліченых вышэй і вырашыць гэтым летам адкрываць «новыя» землі. Паверце, што гэта вельмі весела, карысна і прыемна, а галоўнае: мы выдатна загарэлі і адпачылі перад пачаткам новага навучальнага года.

Ад імя каманды—
Б. ФІЛАТАЎ.

Рэдактар
М. І. ІОСЬКА.

АТ 13491. **Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. 994.